УДК 94 (476)

# ЗАБЫТЫЯ ІМЁНЫ БЕЛАРУСІ: АЛЬФРЭД РОМЕР

***А. К. Шымак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, helenaszymak@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца асоба выдатнага мастака XIX ст., разьбяра, медальера, геральдыста, навукоўца, удзельніка паўстання 1863 г. Альфрэда Ромера (1832–1897), які найбольш плённыя гады свайго жыцця правёў у Беларусі, у маёнтку Каралінова.

***Ключавыя словы***: *гісторыя беларускага мастацтва; паўстанне 1863–1864 гг.; жывапіс.*

# ЗАБЫТЫЕ ИМЕНА БЕЛАРУСИ: АЛЬФРЕД РОМЕР

***Е. К. Шимак***

*Белорусский государственный уиверситет, ул. Красноармейская, 6, 220030, г. Минск, Беларусь, helenaszymak@gmail.com*

В статье рассматривается личность замечательного художника XIX в., резчика, медальера, геральдиста, ученого, участника восстания 1863 г. Альфреда Ромера (1832–1897), который наиболее плодотворные годы своей жизни провел в Беларуси, в имении Королиново.

***Ключевые слова:*** *история белорусского искусства; восстание 1863–1864 гг.; живопись.*

# FORGOTTEN NAMESOF BELARUS: ALFRED ROMER

***A. Shymak***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, helenaszymak@gmail.com*

The article examines the personality of a remarkable artist of the 19th century, carver, medalist, heraldist, scientist, participant in the 1863 uprising Alfred Romer (1832–1897), who spent the most fruitful years of his life in the Korolinovo estate.

***Keywords***: *history of Belarusian art; uprising of 1863–1864; painting.*

Выяўленчае мастацтва суправаджае чалавека на працягу многіх тысячагоддзяў. Кожная гістарычная эпоха мае сваё адлюстраванне ў жывапісе. Развіццё беларускага мастацтва таксама праходзіла ў цеснай сувязі з гісторыяй беларускага народа, з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці. Падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне да Расійскай імперыі не маглі не адбіцца на беларускім мастацтве. Беларусь стала ўскраінай вялізнай дзяржавы, дзе душыліся любыя праявы нацыянальнай культуры. У 1832 г. быў зачынены Віленскі універсітэт – галоўны цэнтр мастацкай адукацыі для Беларусі. Любы малады чалавек, які жадаў атрымаць вышэйшую адукацыю, і не толькі ў галіне мастацтваў, быў вымушаны ехаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Пецярбурга і Масквы, губляючы пры гэтым сувязь з Радзімай, сувязь з нацыянальнымі традыцыямі і культурай. У 1840 г. было забаронена ўжыванне тэрміна «Беларусь». У афіцыйных дакументах з'явіўся безаблічны «Паўночна-Заходні край».

Менавіта па гэтых прычынах, спадчына мастакоў XIX ст. – ураджэнцаў Беларусі, а таксама тых, хто правёў тут значны перыяд свайго жыцця, – уключаецца ў кантэкст мастацкай гісторыі Расіі, Польшчы, Літвы. Вялікія калекцыі іх твораў ёсць у зборах нацыянальных музеяў у Варшаве і Кракаве, у Вільні, у Маскве. Доўгія гады гісторыя беларускага мастацтва разглядалася толькі ў сувязі з рускай культурай. З-за гэтага былі забытыя многія выдатныя імёны, а іх мастацкія творы, на жаль, і па сённяшні дзень не знаходзяць сабе месца ў фондах Нацыянальнага музея Беларусі сярод шэрагу прадстаўнікоў рускага мастацтва.

Такой асобай, вартай увагі, з'яўляецца Альфрэд Ромер – выдатны мастак, разьбяр, медальер, геральдыст, удзельнік паўстання 1863 г. Польскія, літоўскія і нямецкія гісторыкі, даючы звесткі пра гэтага дзеяча, адзначаюць, што Альфрэд Ромер з'яўляецца польскім, літоўскім і беларускім мастаком. І толькі беларуская гістарыяграфія застаўляе па-за ўвагай жыццёвы шлях гэтага чалавека, найбольш плённыя гады творчасці якога былі непасрэдна звязаны з нашай краінай.

Альфрэд Ромер – прадстаўнік адзінаццатага пакалення роду Ромераў. Ромер – старажытны саксонскі род, адна галіна якога ў XIII ст. асела ў Інфлянтах. На мяжы XVI–XVII стагоддзяў Стэфан Ромер (1560–1635) за ўдзел у бітве пад Кірхгольмам

атрымаў маёмасць у Курляндыі. У другой палове XVII ст. Ромеры пераехалі на літоўскія землі, дзе з цягам часу адмовіліся ад пратэстантызму і прынялі каталіцтва. Старэйшы сын Стэфана – Матэуш, займаў пасаду генерала літоўскай артылерыі (1673 г.), быў ўдзельнікам ваенных паходаў Яна III Сабескага. Сын генерала Матэуша, таксама Матэуш, быў паслом на варшаўскі сейм 1695 г., пазней стаў троцкім падкаморым. З прадстаўнікоў роду Ромераў XVIII ст. найбольш актыўным і знакамітым быў Стэфан Дамінік Ромер (1721–1793), троцкі падкаморы і пасол на сеймы, дзе прадстаўляў інтарэсы Радзівілаў. Сынам Стэфана Дамініка быў Міхал Юзэф Ромер (1778–1853), маршалак шляхты віленска-літоўскай губерні, вучыўся ў прыватнай школе ў Сакулцы, а пазней – у Вільні, дзе займаўся грамадскай дзейнасцю, і карыстаўся аўтарытэтам [2, s. 66]. Быў прэзідэнтам віленскага галоўнага суду, у 1812 г. – прызначаны Напалеонам прэзідэнтам горада Вільня, 1820–1826 гг. – прадстаўляў інтарэсы Радзівілаў у сувязі з канфіскацыяй маёмасці Дамініка Радзівіла. Быў членам Таварыства шубраўцаў, актыўным удзельнікам масонсккай ложы «Руплівы Ліцвін». У 1826 г. Міхал Юзэф Ромер быў арыштаваны, адбываў турэмнае зняволенне ў Петрапаўлаўскай крэпасці, а ў 1830–1832 гг – быў сасланы ў Варонеж.

Эдвард Ян – адзін з шасці дзяцей Міхала нарадзіўся ў 1806 г. Калі ў 1830 г. распачалося паўстанне, увайшоў у склад Галоўнага Камітэту, які павінен быў кіраваць акцыямі на тэраторыі былога Вялікага княства Літоўскага. Непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях не прымаў і таму змог пазбегнуць суровых рэпрэсій. Але ў 1833 г. усё ж такі быў арыштаваны і сасланы на пажыццёвае пасяленне ў Волагду. Але гэтага ўдалося пазбегнуць, і праз год Эдвард вярнуўся ў Вільню. Па запрашэнню Шымона Канарскага ўдзельнічаў у працы Дэмакратычнага таварыства, за што і быў арыштаваны ў 1838 г. і, зноў жа, сасланы ў Волагду [3, s. IV–XIII].

Такімі былі продкі Альфрэда Ромера – свабодалюбівымі, патрыятычнымі, адукаванымі і аўтарытэтнымі. І ў такой сям'і ў Эдварда Ромера і Анны з роду Бялазораў 1832 г. нарадзіўся сын Альфрэд. У той час, калі яго бацька Эдвард адбываў ссылку ў Расіі, Альфрэд разам з малодшым братам выхоўваўся ў Вільні пад апекай свайго дзеда Міхала і яго жонкі Рахэлі.

Першую адукацыю атрымаў дома, а пазней – у шляхецкім інстытуце ў Вільні. З дзяцінства праяўлях схільнасць да малявання, урокі жывапісу браў у віленскага мастака Кануція Русецкага. Пазней знаходзіўся разам з сям'ёй бацькі ў Волагдзе (Эдвард Ромер пасля смерці жонкі Анны ажаніўся другі раз. У 1857 г. – з адукацыйнымі мэтамі распачаў падарожжа па краінах Еўропы. Наведаў Дрэздан, Парыж, накіраваўся ў Бельгію і Італію. Сустракаўся з Яўхімам Лелявелям, наведваў князя Адама Чартарыйскага і яго атэль Ламбер [6, s. 419–422].

У 1859 г. вярнуўся дадому і заняўся гаспадаркай у спадчынным маёнтку Крэўна Вількамірскага павету. Яму дапамагаў яго верны сябар Фларыян Даноўскі, які вярнуўся з сібірскай ссылкі.

Але хутка звыклае жыццё скончылася. Неспакойныя час 1863 году апісвае сам Альфрэд Ромер у сваіх успамінах: «У атмасферы той вясковай цішы было нешта небяспечнае, распаўсюджваліся нейкія недакладныя звесткі, якія пераходзілі з вуснаў у вусны, і было незразумелым, адкуль яны з'явіліся: то чуткі пра перамяшчэнні па ваколіцах вайсковых аддзелаў ці паўстанцаў, то аб арыштах і пакараннях, якія праводзілі ўлады, то аб кантрыбуцыях, якія накладалі на маёнткі. Часам прыбягаў перапужаны хлопец, і дрыжачай рукой даставаў схаваную ў хусце картку, і тым падаваў знак, што схаваныя параненыя патрабуюць дапамогі і апекі. І вусны яго дрыжалі, калі папярэджваў, што ворагі блізка. Хавацца не было дзе, трэба было жыць сярод усяго гэтага». [4, s. 602]. А. Ромер апісвае, што часам ў яго маёнтак прыбывалі царскія войскі, патрабуючы ежы. Магчымасці ім адмовіць не было. І калі вайскоўцы былі накормленымі і ўжо на добрым падпітку, псавалі іх зброю. Падтрымліваць сувязі з шматлікімі суседзямі было складана і выклікала падазрэнні, па вёсках стаялі варты. Але цішком наведваліся адны да другіх, папярэджваючы аб небяспецы.

У 1864 г. А. Ромер быў арыштаваны і змешчаны ў Дынабургскую крэпасць. Яго ўспаміны з часу, праведзенага пад арыштам, з'яўляюцца вельмі цікавым гістарычным дакументам. Аўтар апісвае быт, штодзеннасць, настрой зняволеных за ўдзел у паўстанні. Паказвае нязломны дух і высокую маральнасць гэтых людзей. Расказваючы пра асаблівасці ўтрымання арыштаваных у Дынабургу, А. Ромер адзначае бюракратызм, абмежаванасць, карупцыю прадстаўнікоў царскай улады. І цікава тое, што гэты вобраз царскай расійскай улады падаецца не праз тэорыю ці абстрактныя ідэі, а праз уласны вопыт і штодзённае судакрананне з прадстаўнікамі гэтай улады.

«Мы не апускалі твару далоў, нягледзячы на няўпэўненасць, трывогу і боль у сэрцы, абы толькі не ўпасці і не зламацца. Усё іншае выклікала менш страху. Паміж намі не было ні п'яніцы, ні зладзея, не даносчыка, а знаходзілася і шмат простых людзей, бедных і неадукаваных, якія акрамя ботаў на нагах, нічога з сабой не мелі. Скінуўшыся грашыма, мы імкнуліся падрыхтаваць іх да выгнання». [4, s. 729].

Па загаду Н.М. Мураўёва Альфрэд Ромер, нягледзячы на тое, што быў апраўданы судом, павінен быў выехаць на сталае жыццё ў Кастрамскую губерню. Але дзякуючы збегу абставінаў (Н.М. Мураўёва змяніў на яго пасадзе К.П. Каўфман) і дапамозе родных, А. Ромер у жніўні 1865 г. быў вызвалены, з умовай канфіскацыі маёнтку.

У хуткім часе пасля вызвалення ізноў выехаў за мяжу, дзе працягнуў свае заняткі на ніве выяўленчага мастацтва. У 1871–1874 гг. навучаўся у Мюнхенскай акадэміі жывапісу, дзе па сённяшні дзень значыцца ў шэрагу выдатных выпускнікоў гэтай навучальнай установы [1]. Гады вандравання не прайшлі безсэнсоўна. А. Ромер вывучаў жывапіс у Германіі, Італіі. У Мюнхене, Парыжы і Кракаве праходзілі яго выставы.

У 1874 г. вярнуўся на Радзіму і ў Вішневе Ашмянскага павету ў касцёле Св. Тадэвуша ўзяў шлюб з Вандай Сулістроўскай, якая была трэцяй з чатырох дачок Эдмунда Сулістроўскага і Антаніны Карніцкай. Ванда Сулістроўская была маладзейшая за Альфрэда на 20 год. У якасці пасагу ад бацькоў яна атрымала маёнтак Каралінова ў Свянцянскім павеце (сучасны Пастаўскі раён, Віцебскай вобласці). І як апісвае гэтыя падзе Г. Масціцкі: «Альфрэд цалкам прысвяціў сябе мастацтву, сямейнаму жыццю ва ўлюбёным куточку Літвы» [4, s. 580].

У тых нешматлікіх працах, прысвечаных жыццю і творчасці Альфрэда Ромера, аднадушна адзначаецца, што гады праведзеныя ў Каралінове, былі найбольш плённымі ў жыцці мастака. А. Ромер маляваў партрэты, гравюры, жывапісныя кампазіцыі пра жыццё і быт беларускіх сялян. Удзельнічаў у роспісе праваслаўных і каталіцкіх святыняў. Ствараў цудоўныя медалі. А. Ромер быў не толькі мастаком, але і выдатным навукоўцам. Падрыхтаваў даследаванне пра слуцкія паясы, збіраў старажытныя рукапісы і дакументы. Вывучаў гісторыю Віленскай мастацкай школы [5; 7].

А. Ромер меў перадавыя погляды наконт вядзення гаспадаркі. Яго маёнтак Каралінова прыносіў немалы прыбытак. Разам са сваімі сваякамі Янам Карловічам (жанаты на Ірэне Сулістроўскай), Ігнацыем Чаховічам (жанаты з Селінай Сулістроўскай) і Канстантам Скірмунтам, уладальнікам маёнтка Шэметава, Альфрэд Ромер удзельнічаў у стварэнні пазыкова-ашчаднага банку, які добра развіваўся, але пасля смерці К. Скірмунта і ад'езду Я. Карловіча і А. Ромера, прыйшоў у заняпадак [6, s. 431].

Між іншым, маёнткам займаўся Фларыян Даноўскі, сябар Ромера, які жыў тут да канца свайго жыцця і пахаваны недалёка ад сядзібы, на могілках вёскі Канябічы. У 80-я гг. XIX ст. сям'я Ромера пераяждае ў Кракаў. Гэты ад'езд быў звязаны з жаданнем даць лепшую адукацыю дачцэ Алене. Тут А. Ромер і далей працуе як мастак і навуковец.

Памёр ён у сваім маёнтку Каралінова з-за трагічнай выпадковасці ў 1897 г., ад інфекцыі, якая развілася ад невялікай раны на руцэ. Пахаваны ў радавым магільным склепе ў Тракаі (Літва).

Пасля смерці мастака яго дачка Алена падлічыла, што ім было створана больш за 200 мастацкіх твораў (63 жывапісныя палотны, 81 пастэль, 41 медальён, 9 скульптур, некалькі дзясяткаў малюнкаў, пейзажаў і акварэляў, копіі ікон і партрэтаў). Яго пейзажы, гравюры, партрэты цікавыя не толькі як твор мастацтва, але і як гістарычны дакумент. Бо вельмі часта на сваіх карцінах ён адлюстроўваў паўсядзённае жыццё беларускіх сялян, архітэктурныя помнікі Беларусі, якія да нашага часу ўжо не захаваліся.

У сучасны момант у Беларусі ёсць дзве ўнікальныя карціны гэтага мастака. Адна ў касцёле Унебаўзяцця Панны Марыі ў Пінску. Яе яшчэ называюць Пінская Мадонна. На блакітным фоне ў промнях святла намаляваная Божая Маці. Альфрэд Ромер маляваў гэты абраз спецыяльна для пінскага касцёла. Лічыцца, што мастак адлюстраваў на карціне простую пінскую дзяўчыну.

Другая карціна – «Ісус і дзіця» знаходзіцца ў вёсцы Камаі, недалёка ад маёнтка Ромераў. Лічыцца, што такім быў запавет мастака, каб карціна захоўвалася менавіта ў касцёле. Таму шматлікія пакупнікі, якія хацелі б займець гэтую працу, да гэтага часу з'язджаюць ні з чым. Тут жа, у касцёле, ўсталяваная памятная дошка ў гонар Альфрэда Ромера. Адна з вуліц вёскі Камаі названая імем знакамітага мастака. Дзіцячая мастацкая школа ў горадзе Паставы носіць імя Альфрэда Ромера [8].

Вялікія калекцыі работ Альфрэда Ромера ў цяперашні час захоўваюцца ў Нацыянальным музеі Літвы ў Вільнюсе і Нацыянальным музеі Варшавы. У Беларусі інфармацыю пра знакамітага мастака прыходзіцца збіраць па крупінках. Так, напрыклад, у музеі гісторыі і рэлігіі ў Гродне захоўваецца калекцыя фатаграфій з асабістага альбома Альфрэда Ромера. На выставе, якая праходзіла некалькі гадоў таму, былі прадстаўлены гэтыя фатаграфіі.

Аб’ектыў фотаапарата на імгненне затрымаў час і захаваў сваякоў, сяброў, калегаў жывапісца, знаёмых і незнаёмых яму людзей.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што Альфрэд Ромер –выдатная асоба, якая павінна па-сапраўднаму ўвайсці ў нацыянальную гісторыю выяўленчага мастацтва Беларусі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Akademie der Bildenden Künste München. Matrikelbuch. Alfred von Roemer. Режим доступа: https://matrikel.adbk.de/matrikel/mb_1841–1884/jahr_1871/matrikel-02712. Дата доступа: 19.11.2019.
2. Mościcki, H. Pod znakiem orła i pogoni. Lwów : Książnica Polska, 1923.
3. Nie ustawajmy więc w ochocie pisania...: z listów i dzienników trzech pokoleń / wybór, opracowanie i wstęp Danuta Kamolowa. Warszawa : Krąg, 1992.
4. Römer, A. Wspomnienia z r. 1864–1865 // Tygodnik ilustrowany. 1912. nr. 28, s. 664; nr. 29, s.602–603; nr.30, s. 626–627; nr. 31, s. 645–646; nr. 32, s. 684; nr. 34, s. 710; nr. 35, s. 770; nr. 38, s. 793.
5. Römer, Alfred // Werke im Nationalmuseum Warschau/Muzeum Narodowe w Warszawie auf Muzeum Cyfrowe. Режим доступа: http://cyfrowe.mnw.art.pl/dmuseion/results?q=R%C3%B6mer%2C+Alfred&action=SimpleSearchAction&mdirids=1&type=-2. Дата доступа: 19.11.2019.
6. Romer, E. Monografia rodu Römerów na Inflantach i Litwie...”. Vilnius: Kultūros, filosofijos ir meno institutas, 2009.
7. Virtuali paroda „Dailininkų Römerių kūryba“. I dalis. Radvilų rūmų muziejaus lankytojams. Режим доступа: http://old.ldm.lt/RRM/Rom_virtuali.htm. Дата доступа: 19.11.2019.
8. Памяць. Пастаўскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. : К. І. Козак, А. І. Кузняцоў. Мінск : Белта, 2001.

УДК 930.85

## ФАРМАВАННЕ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ЛАТВІІ

***М. Янковяк***

*Славянскі інстытут Акадэміі навук Чэшскай Рэспублікі, вул. Валентынска 1, 11000, г. Прага, Чэшская Рэспубліка, mirek.jankowiak@gmail.com*

У артыкуле аналізунецца фармаванне ідэнтычнасці беларусаў Латвіі, як гарадскога, так і сельскага насельніцтва. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў розныя чыннікі спрыялі фарміраванню нацыянальнай тоеснасці ці русіфікацыі – змены дзяржаўнай прыналежнасці, палітыка ўладаў у дачыненні да нацменшасцяў, культурна-грамадская актыўнасць саміх беларусаў і г.д.

***Ключавыя словы:*** *беларусы Латвіі; Латвія; беларусы замежжа; нацыянальная ідэнтычнасць; беларуска-латвійскае памежжа.*

## ФОРМИРОВАНИЕ ИДЕНТИЧНОСТИ БЕЛОРУСОВ ЛАТВИИ

***М. Янковяк***

*Славянский институт Академии наук Чешской Республики, ул. Валентинска 1, 11000, г. Прага, Чешская Республика, mirek.jankowiak@gmail.com*

В статье анализируется формирование идентичности белорусов Латвии, как городского, так и сельского населения. В течении последних десятилетий разные факторы влияли на формирование идентичности или русификации – изменение границ, политика властей в отношении к нацменьшинствам, активность самих белорусов и т.д.

***Ключевые слова:*** *белорусы Латвии; Латвия; белорусы заграницей; национальная идентичность; белорусско-латвийское приграничье.*